# 2024 год – 80 гадоў з часу заснавання ўстановы аховы здароўя «Кобрынская цэнтральная раённая бальніца» (1944)



Паводле некаторых звестак, ужо ў XVI стагоддзі ў Кобрыне існавала ўстанова накшалт бальніцы. Аднак першае дакументальнае ўпамінанне, якое датычыцца медыцыны, адносіцца да канца XVIII стагоддзя: згодна з рэвізіяй 1792 года ў горадзе ў тую пару пражываў адзін лекар. У 1846 годзе ўзнікла вайсковая часовая бальніца на 100 ложкаў. Першая гарадская бальніца на 15 ложкаў адкрыта ў 1856 годзе, у штаце было пяць медработнікаў.

Калі пачалося будаўніцтва Палескай чыгункі (1882), у будынку паштовай станцыі на заходняй ускраіне Кобрына адкрылі гарнізонны шпіталь. У 1930-я гады ў Кобрыне было дзве бальніцы — павятовая і яўрэйская. Пасля ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР у верасні 1939 годзе на Кобрыншчыне ўведзена бясплатнае медыцынскае абслугоўванне насельніцтва, створана спецыяльнае дзіцячае і радзільнае аддзяленне на 15 хворых, адкрыта інфекцыйная бальніца. Далейшае развіццё медыцынскага абслугоўвання ў краі было перарвана Вялікай Айчыннай вайной. І толькі пасля вызвалення ад фашысцкіх акупантаў тэрыторыі раёна ў ліпені 1944 года адкрылася новая старонка ў гісторыі аховы здароўя Кобрыншчыны.

Гісторыя Кобрынскай цэнтральнай раённай бальніцы (ЦРБ), як і бальніц іншых райцэнтраў, бярэ свой пачатак з 1944 года. Менавіта тады ў ліпені была прынята пастанова Савета Міністраў СССР і рашэнне ЦК КПСС аб стварэнні на вызваленых тэрыторыях раённых бальніц. На падставе загаду загадчыка Кобрынскага райаддзела аховы здароўя № 1 ад 26.07.1944 года ў г. Кобрыне створана бальніца на 180 ложкаў, якая з'яўлялася самастойнай медыцынскай установай. Так пачынала свой шлях раённая ахова здароўя.

У жніўні 1948 года ў склад бальніцы ўвайшлі: паліклініка, жаночая і дзіцячая кансультацыі, раддом. Была прысвоена назва - Бальнічна-Паліклінічнае аб'яднанне Кобрынскай раённай бальніцы. У жніўні 1956 года ў складзе Кобрынскай ЦРБ функцыянавалі: санэпідэмічны аддзел, супрацьтуберкулёзны і скурна-венералагічны дыспансеры, пяць

участковых бальніц, тры ўчастковыя амбулаторыі, 10 пунктаў аховы здароўя, станцыя хуткай дапамогі, тры дзіцячых ясляў, 38 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, дзіцячая бальніца і Дзівінская туберкулёзная бальніца.

У 1973 годзе пабудаваны новы корпус ЦРБ на 400 ложкаў. Рашэннем выканаўчага камітэта Кобрынскага Савета народных дэпутатаў № 358 ад 29.12.1989 года Кобрынская ЦРБ перайменавана ў Кобрынскае тэрытарыяльнае медыцынскае аб'яднанне.

Рашэннем Кобрынскага райвыканкама ад 27.03.2001 года № 138 Кобрынскае тэрытарыяльнае медыцынскае аб'яднанне перайменавана ва ўстанову аховы здароўя «Кобрынскае ТМА». У 2007 годзе ЦРБ быў перададзены будынак рэканструяванага пад паліклініку прафілакторыя прадзільна-ткацкай фабрыкі «Ручайка», праведзены капітальны рамонт старога корпуса паліклінікі, што дазволіла палепшыць умовы працы медыцынскага персаналу і значна скараціць чэргі пацыентаў.

На сённяшні дзень ўстановы аховы здароўя «Кобрынская цэнтральная раённая бальніца» ўяўляе сабой цэлую сетку ўстаноў, абсталяваных сучасным лячэбна-дыягнастычным абсталяваннем. У структуры ўстановы - 350 стацыянарных ложкаў, размешчаных у ЦРБ, радзільным доме, дзіцячай бальніцы, у трох участковых бальніцах і адной бальніцы сястрынскага догляду. Амбулаторна-паліклінічная дапамога аказваецца ў раённай паліклініцы, жаночай і дзіцячай кансультацыях, у 10 урачэбных амбулаторыях і на 25 ФАПах.

У Кобрынскай ЦРБ вядзецца актыўная работа па рэканструкцыі медыцынскіх аб'ектаў, іх аптымізацыі, умацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы. Вялікая ўвага надаецца мадэрнізацыі. Толькі за апошнія гады поўнасцю аснашчана сучасным высакакласным лабараторным абсталяваннем клініка-дыягнастычная лабараторыя, што дае магчымасць праводзіць на высокім узроўні гемастазіялагічныя, гематалагічныя, біяхімічныя і іншыя даследаванні.

Кобрынская ЦРБ адна з першых у вобласці пачала работу на лічбавым рэнтгенаўскім апараце без выкарыстання рэнтгенаўскай плёнкі і ў 2019 годзе поўнасцю перайшла на лічбавы варыянт работы. У 2021 годзе ўстаноўлены сучасны КТ-апарат, які дапамагае ў абследаванні лёгкіх, бронхаў, галаўнога мозгу, пазваночніка, сасудаў, лімфавузлоў. З 2022 года для магчымасці правядзення КТ-даследаванняў з

кантрасным узмацненнем у кабінеце камп'ютарнай тамаграфіі ўведзены ў работу ін'ектар. У 2022 годзе УГД-апараты устаноўлены ў філіяле «Радзільны дом» і ў філіяле «Дзіцячая бальніца», Дзівінскай і Гарадзецкай участковых бальніцах. Працягваецца інфарматызацыя структурных падраздзяленняў з фарміраваннем адзінай электроннай базы даных пацыента, закуплены 44 рабочыя месцы - праграма МАПСОФТ, 22 ПЭВМ. Для аказання медыцынскай дапамогі жыхарам сельскіх населеных пунктаў набыты перасовачны медыцынскі комплекс.

Кобрынская ЦРБ з'яўляецца шматпрофільнай медыцынскай установай, якая аказвае медыка-дыягнастычную дапамогу насельніцтву па ўсіх лячэбных накірунках. Дадаткова да дзяржаўнага аб'ёму бясплатнай медыцынскай дапамогі ва ўстанове аказваецца шырокі пералік платных паслуг. У бальніцы ўдалося стварыць моцную каманду аднадумцаў на чале з галоўным урачом Кобрынскай ЦРБ Мікалаем Леанідавічам Брашко. Урачы, сярэдні, малодшы медперсанал - усе добрасумленна, адказна выконваюць сваю працу і імкнуцца рабіць яе якасна. Кобрынская ЦРБ не раз станавілася пераможцам абласнога агляду-конкурсу ўстаноў аховы здароўя па павышэнні якасці і культуры медыцынскага абслугоўвання насельніцтва.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Мартынаў, А. М**. З гісторыі аховы здароўя на Кобрыншчыне / А. М. Мартынаў // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 134-136.

**Установе** аховы здароўя «Кобрынская цэнтральная раённая бальніца» (1944) - 80 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 144-145.

**Волотовская, А. В.** Если профессия — врач / [Алла Волотовская ; беседовала] Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2024. — 20 студзеня (№ 3). — С. 6 : фот.

Беседа с заместителем главного врача по медицинской части УЗ "Кобринская ЦРБ" врачом-неврологом Аллой Волотовской.

**Бакун, Е**. Живет по клятве Гиппократа / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 16 снежня (№ 72). — С. 6 : фот.

О работе заместителя главного врача по медицинскому обслуживанию населения района УЗ "Кобринская ЦРБ" Оксаны Сивенковой.

**Бакун, Е.** Дарят людям счастье / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2023. - 18 лістапада (№ 68). – С. 13 : іл.

24 ноября филиал «Родильный дом» Кобринской ЦРБ отметит свое 30-тилетие.

**Бакун, Е.** Когда коллектив команда / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 22 красавіка (№ 30). — С. 1, 9 : фот.

За выполнение основных целевых показателей учреждение здравоохранения "Кобринская центральная районная больница" занесено на Доску почета Брестской области.

**Бакун, Е.** Медицина — это призвание / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 17 чэрвеня (№ 44). — С. 1, 4 : фот.

О работе Кобринской районной поликлиники.

**Бакун, Е.** Успех — дело общее / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 15 сакавіка (№ 19). — С. 6 : фот.

О работе Кобринской ЦРБ по рассказу заместителя главного врача по медицинскому обслуживанию населения Оксаны Сивенковой.

**Белов, Д.** Спасая здоровье и жизни: кобринские медики подвели итоги года / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2023. — 21 студзеня (№ 5). — С. 2 : фот.

Состоялось заседание медико-санитарного совета УЗ "Кобринская центральная районная больница".

**Вечерко, В.** Новое в хирургии Кобринской ЦРБ. ТАРР-герниопластика: новый способ оперативного лечения грыж / Вячеслав Вечерко // Кобрынскі веснік. - 2023. — 7 кастрычніка (№ 62). — С. 17.

**Трудовые** победы, достойные награды / по информации Брестского облисполкома подготовила Лидия Курбат // Заря. - 2023. — 22 апреля (№ 31). — С. 4.

О занесении на Доску почета Брестской области победителей соревнования 2022 года, в т. ч. Кобринскую ЦРБ.

**Елизарова, Ж.** За жизнь и здоровье в ответе / Жанна Елизарова ; фото: Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2022. — 16 ліпеня (№ 53). — С. 10 : фот.

О работе Кобринской ЦРБ по повышению качества и культуры медицинского обслуживания.

**Бакун, Е.** Для блага населения / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. — 17 ліпеня (№ 56). — С. 9 : фот.

О модернизации оборудования в Кобринской центральной районной больнице.

**Бакун, Е.** Кобрин получил первый компьютерный томограф / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. — 6 студзеня (№ 2). — С. 4 : фот.

**Бакун, Е.** Первые пациенты районной больницы прошли обследование на КТ-аппарате / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. — 13 лютага (№ 13). — С. 3 : фот.

В Кобринской центральной районной больнице открылся кабинет компьютерной томографии.

**Бакун, Е.** Первые аккредитованные / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. — 1 снежня (№ 95). — С. 3 : фот.

В числе первых в республике Кобринская центральная районная больница получила свидетельство о медицинской аккредитации.

**Бакун, Е**. Сертификат за качество и профессионализм / Елена Бакун // Заря. - 2021. — 17 февраля (№ 13). — С. 18 : фот.

Клинико-диагностическая лаборатория Кобринской ЦРБ получила сертификат системы внешней оценки качества лабараторных исследований Великобритании.

**Белов, Д.** Николай Брашко: "Все "тяжелые" случаи — непривитые пациенты" / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2021. - 2 кастрычніка (№ 78). — С. 1 : фот.

О прививочной кампании против инфекции COVID-19 по информации главного врача УЗ "Кобринская ЦРБ" Николая Брашко.

**Брашко, Н. Л**. Николай Брашко: "Отделения центральной больницы функционируют в штатном режиме" / Николай Брашко ; [беседовала] Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2021. — 18 февраля (№ 7). — С. 5 : фот.

Беседа с главным врачом УЗ "Кобринская центральная районная больница" Н. Л. Брашко.

**Бакун, Е.** На охране здоровья / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2020. — 10 чэрвеня (№ 44). — С. 3 : фот.

О работе УЗ "Кобринская центральная районная больница".

**Бакун, Е.** Лучшие в области / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2019. — 10 красавіка. — С. 1, 3.

УЗ «Кобринская ЦРБ» — победитель областного смотра-конкурса учреждений здравоохранения по повышению качества и культуры медицинского обслуживания населения.

**Бялоў, Д**. Новае абсталяванне — для здароўя кабрынчан / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2019. — 27 лістапада (№ 92). — С. 3 : фот.

Кобрынская цэнтральная раённая бальніца папоўнілася новым абсталяваннем.

**Занесены** на доску Почета // Заря. - 2019. - 4 мая. – С. 3.

Учреждение здравоохранения "Кобринская центральная районная больница" — среди победителей областного соревнования за 2018 г.

**Наши** медики — третьи в области! // Кобрынскі веснік. - 2017. — 22 лютага. — С. 2.

УЗ "Кобринская центральная районная больница" заняла почетное третье место по итогам работы районных медицинских учреждений за 2016 г.

**Марчук, Н.** С факелом Гиппократа / Нина Марчук // Кобрин-информ. - 2017. — 30 марта. — С. 5.

История медицины нашего края.

**Пашковіч, Л.** Медыкі адзначылі прафесіянальнае свята / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2017. - 21 чэрвеня. - С. 3.

У сістэме Кобрынскай цэнтральнай раённай бальніцы працуе каля 1900 чалавек, з якіх 280 урачоў.

**Тимошук, А.** Дом, где рождается чудо / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. - 2016. — 24 лютага. — С. 3.

О работе филиала "Родильный дом" Кобринской ЦРБ.

**Белов, Д.** А начиналось с самого необходимого… / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2015. – 14 студзеня. – С. 4.

Из истории Кобринской центральной районной больницы.

**Кривецкий, В.** Здоровый человек – человек созидательный / Вячеслав Кривецкий ; [беседовал] Игорь Сидорук // Кобрынскі веснік. – 2015. – 20 чэрвеня. – С. 3.

Главврач УЗ «Кобринская ЦРБ» Вячеслав Кривецкий накануне профессионального праздника - о системе здравоохранения Кобрина и района.

**Жук, Е. В** Кобрине открылось отделение гемодиализа / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2014. - 22 кастрычніка. - С. 2.

**Крывецкі, В.** Медыцына для людзей / Вячаслаў Крывецкі ; [гутарыла] Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. — 2014. — 2 жніўня. — С. 3.

Галоўны ўрач цэнтральнай раённай бальніцы В. Крывецкі – аб стане медыцыны на Кобрыншчыне.

**Кривецкий, В. А.** Кобринская медицина: будни и праздники / В. А. Кривецкий ; [беседовала] Анна Казакова // Кобрин-информ. – 2014. – 19 июня. – С. 6.

Интервью с главврачом центральной районной больницы В. Кривецким об успехах местной медицины.

**Кривецкий, В.** А. Медицина: день завтрашний / Вячеслав Кривецкий ; [беседовала] Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2013. — 20 июня. — С. 26.

О том, чем живет Кобринская районная больница сегодня, рассказывает главврач УЗ "Кобринская ЦРБ" В. Кривецкий.

**Кривецкий, В. А.** Кобринские медики готовы идти в ногу со временем / В. А. Кривецкий // Кобрин-информ. - 2010. - 30 декабря. - С. 3.

**Савчук, М**. Кобринская ЦРБ пополнится молодыми врачами / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2010. - 17 июня. - С. 5.

**Кривецкий, В.** Кобринская ЦРБ: заботы дня сегодняшнего / Вячеслав Кривецкий ; [беседовал] Алла Шевченко // Кобрин-информ. - 2009. - 18 июня. – С. 2.

**Шевченко, А.** Кобринская ЦРБ: курс на обновление / Алла Шевченко // Кобрин-информ. - 2008. - 12 июня. - С. 2.

**Магдысюк, С.** Строительная терапия для кобринского здравоохранения / Сергей Магдысюк // Заря. - 2007. - 27 октября. - С. 1.

В Кобрине открылась новая поликлиника.

**Васюк, Н.** Подарок кобринской больнице / Наталья Васюк // Кобрин-информ. – 2004. – 25 ноября. – С. 1.

Кобринская больница получила по гуманитарной линии аппарат УЗИ, аналогов которому в лечебных учреждениях города и района не было.

**Пятроўская, М.** Медыцына: добры вынік на ўзроўні вобласці / Марыя Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2004. – 11 лютага. – С. 3.

Кобрынскі раён
Кобрын
Кобрынская раённая бальніца
Бальніцы
Медыцынскія ўстановы